# АД «РАБОЧЕГО» ДА «СОВЕТСКОЙ БЕЛОРУССИИ»: ТЭНДЭНЦЫІ ТРАНСФАРМАЦЫІ ВЫДАННЯ Ў 1920–1930-я гг.

**П. А. Нядзвецкая**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*polinanedveckaa0@gmail.com*

*Навуковы кіраўнік – Н. А. Зубчонак, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

У артыкуле разглядаюцца тэндэнцыі тэматычнай і жанравай трансфармацыі газеты «Рабочий» («Советская Белоруссия») у 1920–1930-я гг.; тэматыка і жанравая разнастайнасць, асаблівасці зместу і праблематыка выдання.

***Ключавыя словы:*** «Рабочий»; «Советская Белоруссия»; газета; гісторыя; трансфармацыя.

# FROM «RABOCHII» TO «SOVETSKAYA BELORUSSYA»: TRENDS IN THE TRANSFORMATION OF THE PERIODICAL IN 1920–1930s

**P. O. Nedvetskaya**

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: P. O. Nedvetskaya (polinanedveckaa0@gmail.com)*

*Reseach advisor – N. A. Zubchenok, Candidate of Philology, Associate Professor*

The article examines the trends in the thematic and genre transformation of the newspaper «Rabochii» («Sovetskaya Belorussiya») in the 1920s–1930s; thematic and genre diversity, features of the content and subject matter of the periodical.

***Key words:*** «Rabochii»; «Sovetskaya Belorussiya»; newspaper; history; transformation.

Грамадска-палітычная газета «СБ. Беларусь сегодня» з’яўляецца адным з самых буйных і ўплывовых СМІ Беларусі, уваходзіць у вядучы медыяхолдынг нашай краіны разам з іншымі выданнямі. За апошнія гады ў навуковым асяроддзі праводзіцца шмат даследаванняў, у якіх вывучаецца дзейнасць «СБ. Беларусь сегодня» і гісторыя яе стварэння.

Сваё існаванне выданне пачало 9 жніўня 1927 года, тады яно мела назву «Рабочий». Першым адказным рэдактарам газеты стаў Майсей Шульман. Гэтую пасаду ён займаў з 2 жніўня 1927 года па 23 сакавіка 1928-га. Газета прайшла доўгі эвалюцыйны шлях: яе змест змяняўся ў залежнасці ад канцэпцыі выдання, палітычнай абстаноўкі ў краіне і за мяжой. Газета спаўна асвятляла палітычную, сацыяльную і культурную тэматыку, прычым не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах.

Пад назвай «Рабочий» газета выходзіла да 1937 г., а пасля змяніла назву на «Советская Белоруссия». На першым этапе ў выданні асвятляліся пытанні фінансавання і будаўніцтва прадпрыемстваў, падрыхтоўкі кадраў, сацыялістычнага спаборніцтва і г.д. Галоўнай тэмай выдання можна назваць эканоміку: большая частка палос запаўнялася інфармацыяй аб развіцці народна-гаспадарчага комплексу. Нараўне з пытаннямі эканомікі ў газеце «Рабочий» асвятлялася тэма класавай барацьбы. Яшчэ адным важным напрамкам дзейнасці было распаўсюджванне інфармацыі аб калектывізацыі і забеспячэнні калгасаў новай тэхнікай [1, с. 148].

Фармат газеты змяняўся ў залежнасці ад стратэгіі і канцэпцыі. Фарматам А4 яна выдавалася з 1927 г. У 1937 г. пачала выходзіць фарматам А3, як сучаснае выданне. Аб'ём таксама змяняўся: 8 палос («Рабочий») і 4 паласы («Советская Белоруссия»). Газета выходзіла кожны дзень з панядзелка па нядзелю. На працягу часу выданне таксама змяняла і свой дызайн. Так, у нумарах «Советской Белоруссии» мы бачым фатаграфіі практычна на кожнай старонцы. У «Рабочем» месца фота займалі малюнкі, якія ствараліся сіламі рэдакцыі. У асноўным гэта карыкатуры ці ілюстрацыі, падобныя да агітацыйных плакатаў.

Больш разнастайнымі на шрыфты і мастацкае афармленне газета была ў часы «Рабочего». Пазней афармленне стала больш класічным. Тым не менш, тэкст стала цяжэй успрымаць, інфармацыя давалася адзіным «палатном», у якім было складана разабрацца. У «Советской Белоруссии» матэрыялы друкаваліся на ўсю шырыню старонкі, у той час як у «Рабочем» яны былі разбітыя на калонкі, што ў разы палягчала ўспрыманне інфармацыі.

Асобна варта вылучыць загаловачны комплекс газеты. Зверху на першай старонцы «Рабочего» размяшчаўся блок, які складаўся з лозунгу «Пролетарии всех стран, объединяйтесь!», назвы і інфармацыі, каму належыць газета, кошту аднаго асобніка, умоў падпіскі, кантактнай інфармацыі рэдакцыі, умоў размяшчэння рэкламных аб'яў, нумару і даты выхаду выпуску. Загаловачны комплекс абноўленай газеты змяніўся. Акрамя лозунгу, назвы і даты выхаду нумара, з'явіўся раздзел з анонсамі «Сёння ў нумары», а ўмовы падпіскі і размяшчэння рэкламы зніклі, радок з кантактамі перамясціўся на апошнюю старонку.

Змены ў газеце адбыліся не толькі знешнія, але і па зместу. Звернемся да жанравай разнастайнасці нумароў і кантэнта. У «Рабочем» за 6 верасня 1927 года ўсяго размешчана 94 матэрыялы і 11 рэкламных блокаў. Што датычыцца тэматычнай разнастайнасці, то ў нумарах пераважаюць матэрыялы сацыяльнай тэматыкі (36 %), на другім месцы – палітыка (28,8 %), а на трэцім – эканоміка (25,6 %), 9,6 % займаюць публікацыі на культурную тэматыку.

Па жанрах нумар досыць разнастайны. Пераважаюць інфармацыйныя жанры (84,8 %), сярод якіх рэпартаж (5 %), заметкі (71 %), замалёўкі (2 %). 6,5 % прыйшлося на аналітычныя жанры: нататка (1 %), каментарый (1 %), артыкул (4 %). 4,3 % займае мастацка-публіцыстычны блок – нарысы (4 %), літаратурны блок (1,1 %) прадстаўлены ўрыўкам з рамана «Сцежкі-дарожкі» М. Зарэцкага. Таксама ёсць і мастацкі блок – карыкатуры (3 %).

Сярод публікацый на палітычныя тэмы друкаваліся інфармацыйныя заметкі аб падзеях, якія адбываюцца за мяжой. Напрыклад, у матэрыяле «Белогвардейцы в Польше не унимаются» разглядаецца інфармацыя, якую даюць розныя польскія газеты – правільны падыход для непрадузятага асвятлення таго ці іншага пытання. Матэрыял «Белагвардзейцы ў Польшчы не сцішаюцца» складаецца з некалькіх нататак аб нападзе белагвардзейца Трайковіча на супрацоўніка паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР. У выніку няўдалага замаху нападаючы быў забіты кур’ерам паўпрадства Гусевым. Аўтар матэрыялу спасылаецца на бюро друку паўпрадства і на польскія газеты «Пшэгланд вячорны», «Кур’ер Варшаўскі» [2]. Варта адзначыць, што інфармацыя падаецца з разлікам на тое, што чытач ужо знаёмы з парадкам дня і ведае аб здарэнні. Ніякай перадгісторыі матэрыял не змяшчае. І сапраўды, калі паглядзець папярэдні нумар газеты (ад 4 верасня 1927 г.), то там на першай паласе размешчана паведамленне, што на прадстаўніка паўпрадства напалі ў Варшаве [3].

У артыкуле «Вынаходніцкая думка на скурзаводах» разглядаюцца прапановы працоўных па ўдасканаленні вытворчага працэсу. Аўтар прыводзіць ідэі тав. Яечкі, Астроўскага, Лагунова і Серабранскага, з якімі яны выступалі на нарадзе. Усе прапановы былі адобраны, пастаўлена задача іх рэалізаваць. Падобныя матэрыялы друкаваліся ў газетах таго часу з мэтай узмацніць дух пралетарыяту, даць матывацыю актыўна і плённа будаваць сацыялізм і працаваць на карысць Радзімы. У канцы публікацыі аўтар заклікае падтрымліваць ініцыятывы працоўных: «Трэба імкнуцца, каб гэты струмень вынаходніцкай думкі звярнуўся ў магутную плынь і захапіў усіх кваліфікаваных працоўных. Гэтага можна будзе дасягнуць уважлівым стаўленнем да прапаноў працоўных» [2].

Такім перад намі паўстае змест газеты ў часы «Рабочего», калі яна была прамысловым выданнем. Але разам са зменай вектара дзейнасці выдання і

яго пераарыентацыяй у грамадска-палітычны бок змяняецца і змест. Так, у нумары газеты «Советская Белоруссия» за 28 студзеня 1938 г. размешчана 48 публікацый і 24 рэкламныя блокі, сярод іх і спачуванні, і прыватныя аб'явы. Пераважаюць матэрыялы палітычнай тэматыкі (37,9 %), практычна пароўну публікацый пра эканоміку (24,1 %) і сацыяльную сферу (20,7 %), 17,2 % займаюць матэрыялы культурнай тэматыкі.

Што тычыцца жанравай разнастайнасці, то пераважаюць інфармацыйныя жанры (75 %). Сярод іх рэпартаж (2 %), заметкі (34 %). 22,9 % прыйшлося на аналітычныя жанры: нататка (6 %), каментарый (3 %), артыкул (2 %). І 2,1 % займаюць літаратурныя матэрыялы.

У прааналізаваным нумары «Советской Белоруссии» цікавым падалася нататка, размешчаная на другой паласе, «Памятаць аб жывым чалавеку». Аўтар Ільюшэнка распавядае пра скаргі камсамольцаў на няправільныя і неабгрунтаваныя выключэнні іх з арганізацыі. У матэрыяле разглядаюцца такія два выпадкі. Тав. Жаравін з прычыны сваёй нявопытнасці не змог карэктна праводзіць працу па кіраванні камсамольскім камітэтам тэхнікума хлебапячэння. Ільюшэнка піша: «…замест таго, каб указаць маладому камсамольцу на яго недахопы і дапамагчы выправіцца гэтаму таварышу, Сталінскі райкам камсамола 5 студзеня вынес грамавое рашэнне, у якім абвінавацiў Жаравіна ў "развале камсамольскай працы, ігнараванні рашэнняў IV Пленума ЦК УЛКСМ, групаўшчыне, сістэматычных п'янках"» [4]. У матэрыяле расказваецца і гісторыя тав. Сідарэнка, якую звольнілі з пасады сакратара камсамольскага камітэта «Камунаркі» з-за чутак аб тым, што яе бацька – кулак. Завяршае свой матэрыял аўтар заклікам да гаркама камсамола: «Разбор апеляцый камсамольцаў неабходна ўсяляк паскорыць. За кожнай пададзенай у гаркам заявай стаіць жывы чалавек…» [4].

Характэрным для таго часу з'яўляецца матэрыял «Па-стаханаўску берагчы каня». Ф. У. Ляхоўскі – конюх калгаса «Чырвонае Зазер'е» – распавядае, як сумленна і самаадданa ён працуе, дзеліцца сваім вопытам па вырошчванні коней і доглядзе за імі і ў канцы матэрыяла абяцае: «Рыхтуючыся да бальшавіцкай вясны, я бяру на сябе абавязацельства – выдатным доглядам за пагалоўем захаваць усіх працоўных коней да вясны ў вышэйсярэдняй укормленасці» [4].

Такім чынам, зыходзячы з кантэнту прааналізаваных нумароў, можна назіраць, што пасля змены канцэпцыі выдання, матэрыялаў на палітычную тэматыку стала значна больш. Сацыяльная тэматыка саступіла месца палітыцы і эканоміцы. Матэрыялаў культурнай тэматыкі больш у «Советской Белоруссии», чым у «Рабочим». Акрамя таго, змяніўся і знешні выгляд газеты – вёрстка «Советской Белоруссии» складана ўспрымаецца, у адрозненне ад «Рабочего», у якім разам з тэкставай інфармацыяй ёсць шмат і графічнай (малюнкі і карыкатуры). Газета «Советская

Белоруссия» («Рабочий») прайшла дастаткова доўгі эвалюцыйны шлях, каб сёння паўстаць перад намі ў сваім выглядзе. Што тычыцца жанравай прыналежнасці публікацый, то і ў адным, і ў другім нумары захоўваецца жанравая градацыя: інфармацыйная, аналітычная і мастацка-публіцыстычная групы. Аднолькавай асаблівасцю і для «Советской Белоруссии», і для «Рабочего» з'яўляецца наяўнасць матэрыялаў крытычнага зместу ў адносінах да негатыўных з'яў грамадства (п'янства, крадзеж і г. д.). Выданне стваралася ва ўмовах татальнай цэнтралізацыі ўлады і адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання ў спалучэнні з тэрорам. Газета перажыла рэбрэндынг і некалькі змяніла свой кантэнт.

Сёння газета з'яўляецца вядучым друкаваным СМІ Беларусі і з 2013 года ўваходзіць у грамадска-палітычны холдынг. «СБ. Беларусь сегодня» мае багатую гісторыю і вялікі грамадска-палітычны досвед. У параўнанні з газетамі «Рабочий» і «Советская Белоруссия» можна заўважыць, што асноўныя тэндэнцыі захаваліся: вялікая ўвага адводзіцца матэрыялам аб палітыцы і эканоміцы, таксама надаецца ўвага сацыяльнай тэме. Выдавецкі дом «Беларусь сегодня» вядомы не толькі на беларускай медыйнай прасторы, але і за мяжой. «СБ. Беларусь сегодня» шырока выкарыстоўвае ў сваёй працы мультымедыйныя тэхналогіі, актыўна вядзе работу ў сацыяльных сетках. Тэлестудыя «СБ-ТБ» рыхтуе значны аб'ём якаснага кантэнту, праводзіць прамыя трансляцыі розных мерапрыемстваў.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Слука А. Г.* Беларуская журналістыка: падручнік. Мінск: БДУ, 2011. 447 с.
2. Рабочий. 1927. 6 сентября.
3. Рабочий. 1927. 4 сентября.
4. Советская Белоруссия. 1938. 28 января.